**М. А. Курыпка**

# АЛЬТЭРНАТЫЎНАЯ ГІСТОРЫЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ Ў АНГЛІЙСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Антыўтопія як спецыфічны літаратурны жанр дасягае росквіту ў сярэдзіне XX стагоддзя, у перыяд буйных сацыяльна-палітычных і культурных катаклізмаў, дзвюх сусветных войнаў і рэвалюцый, інтэнсіўнага развіцця навукі і стварэння таталітарных рэжымаў. У сваю чаргу раман альтэрнатыўнай гісторыі можна вызначыць як разнавіднасць жанру антыўтопіі, у якім асноўнай абавязковай умовай сюжэта з'яўляецца ўвядзенне альтэрнатыўнага гістарычнага вектара – замест добра вядомых гістарычных падзей, якія мелі месца ў рэальнасці, аўтар уводзіць новы паварот, што змяняе ход гістарычнага развіцця.

Тэма Другой сусветнай вайны ў англійскай літаратуры таксама адзначылася ў другой палове XX стагоддзя з'ўленнем характэрных узораў жанру альтэрнатыўнай гісторыі – узнікненнем элементаў фантастыкі, імкненнем да творчага пошуку і рэпрэзентацыі альтэрнатыўных гістарычных працэсаў ці сферы будучыні. Нягледзячы на сур'ёзнасць тэматыкі, постмадэрнізм, узаемаадносіны якога з папярэдняй культурай і традыцыяй непрадказальныя і супярэчлівыя, дазволіў пашырыць жанравыя перакрыжаванні ваеннай прозы з філасофскім светаадчуваннем і светаўспрыманнем, завострана ўзняў праблему нацыянальных своеасаблівасцяў, навізны ці наватарства формы.

Пад уплывам постмадэрнізму базавай ідэяй для пісьменнікаў становіцца неспасціжнасць ісціны, што робіць немагчымым напісанне дакладнай біяграфіі, а толькі дае магчымасць паказаць уласную інтэрпрэтацыю падзей. З улікам «оруэлаўскай» традыцыі прагназавання змрочнага і гратэскнага свету ў ваеннай прозе праявілася тэндэнцыя пераасэнсавання традыцыйных ўстановак і рэпрэзентацыі іншай ў мастацкіх адносінах гісторыі. Зразумела, раманы Дж. Оруэла «1984» (1949) і У. Голдынга «Уладар мух» («Lord of the Flies», 1954) не мелі прамога дачынення да прозы, прысвечанай вайне, тым не менш тэма таталітарнага грамадства ўскосна перасякалася з тэмай існавання нацызму. Яшчэ адным фактарам, які паўплываў на развіццё альтэрнатыўнай гістарычнай прозы, стала тое, што Вялікабрытанія не зведала акупацыі і нацысцкіх зверстваў, а значыцца, боль народнай памяці не мог перашкодзіць успамінам пра вайну.

Альтернатыўная ваенная гісторыя Брытаніі прадстаўлена ў рамане Л. Дэйтана «Брытанскія СС» («SS–GB», 1978), у якім брытанскі Скотланд-Ярд вымушаны працаваць пад камандваннем нацыстаў, акупіраваўшых краіну. У разрэзе класічнай стэрэатыпнай палярызацыі «злога» немца і «прыстойнага» брытанца або выразнага злачынцы і пераможцы Л. Дэйтан ўвасабляе брытанскую паліцыю звычайнымі людзьмі, якія проста з'яўляюцца такой жа ахвярай вайны і прапаганды, як і шматлікія нямецкія салдаты і афіцэры. Пры ўсёй супярэчлівасці характараў твораў канца 1990-х гадоў важна адзначыць галоўную рысу фарміравання мастацкага вобраза, якой

з'яўляецца ў першую чаргу праблема чалавечага сумлення. Гэта не толькі барацьба чалавека з ворагам ці з самім сабою ў выключных абставінах, а сутыкненне чалавека і «антычалавечага». Калі раней асноўным канфліктам у літаратуры традыцыйна з'яўлялася супрацьстаянне брытанскай арміі, якая абараняе сваю радзіму ад фашызму, што выступаў галоўнай разбуральнай сілай, то зараз гэтай сілай стала не толькі канкрэтная дзяржава ці ідэалогія, але і сам чалавек, як ён ёсць.

Пазней жанр антыўтопіі пашырыўся папулярным раманам Р. Харыса «Фатэрланд» («Fatherland», 1993), падзеі якога адбываюцца ў новым свеце, дзе ўладарыць пераможны Трэці Рэйх. Раман поўніцца рэальнымі гістарычнымі фігурамі, што стварае праўдападобнасць мастацкага твора: кіраўнік крымінальный паліцыі Рэйху Артур Нэбе, сакратар Міністэрства навукі Вільгельм Штукарт, дыпламат Марцін Лютар і інш. Пісьменнік арганічна інтэгруе ў раман напрамую ці ўскосна рэальныя гістарычныя факты: узгадваюцца пэўныя аперацыі крымінальнай паліцыі, гучаць прамовы Адольфа Гітлера ці Генрыха Гімлера, адбываецца спасылка на Ванзэйскую канферэнцыю па «габрэйскім пытанні», а апісанне пасляваеннага Берліна напрамую суадносіцца з будаўнічымі планамі галоўнага архітэктара Рэйху Альберта Шпеера. У канцы рамана з'яўляецца адыёзная фігура кіраўніка люблінскай паліцыі Адзілы Глабоцніка.

Падобнае перапляценне рэальнасці і аўтарскай выдумкі стварае ўяўленне гісторыі, максімальна набліжанай да рэальнай. Раман дазваляе прасачыць станаўленне характару героя, следчага паліцыі Ксаўе Марша, які паступова эвалюцыянуе ад недасведчанасці да раскрыцця звярынай сутнасці нацызму, калі Марш выўяляе пэўную колькасць дакументаў і фактаў, якія праліваюць святло на Халакост і нацысцкія зверствы на ўсходзе Еўропы. Такім чынам пісьменнік падкрэслівае, што гісторыя развіваецца ў адпаведнасці са сваімі ўнутранымі законамі, і дапушчэнне ў мінулым не можа змяніць агульначалавечай пазіцыі ў дачыненні да абсалютнага злачынства, якому гісторыя будзе заўсёды супрацьстаяць.

Варта звярнуцца да яшчэ аднаго твора, які адлюстроўвае альтэрнатыўную гісторыю, – рамана О. Шырса «Супраціўленне» («Resistance», 2007), дзе апавядаецца пра тое, як немцы ўварваліся ў Англію ў канцы 1944 года пасля няўдалай высадкі саюзнікаў у Нармандыі. Фантазія аўтара разгортвае негатыўны сцэнарый падзей, спасылаючыся на фарміраванне брытанскіх СС і калабарантаў, што робіць альтэрнатыўную рэчаіснасць на дзіва рэальнай, адчувальнай і страшнай. Салдаты Вермахта захопліваюць вёску ва Уэльсе, мужчыны якой уступілі ў падпольную арганізацыю Брытаніі. Пісьменнік звяртае ўвагу не столькі на рух супраціўлення, колькі на нечаканую распаўсюджанасць супрацоўніцтва з акупантамі з боку брытанскага насельніцтва. Менавіта таму неадназначнай канцоўкай рамана служыць сцэна, дзе шэраговы Джонатан Стывенс з толькі што ўтворанай дывізіі СС «Альбіён» разгублена глядзіць на рэшткі маленькай вёскі пасля карніцкага рэйду свайго падраздзялення.

У рамане «Дамініён» К. Дж. Сэнсама падзеі разгортваюцца ў лістападзе і снежні 1952 года. Вялікабрытанія – бедная і разбураная дзяржава-сатэліт Вялікай Германіі. Замест супрацьстаяння ў 1940 годзе, трыўмфу ў 1945 і аднаўлення пасляваеннай дзяржавы «Дамініён» паказвае нам, як магла б выглядаць і адчуваць сябе па-сапраўднаму зломленая Брытанія. Прэм'ер-міністр Бівербрук, міністр унутраных спраў Мозлі, міністр па справах Індыі Паўэл і іншыя прадстаўнікі калабарацыйнага рэжыму, каб захаваць гандлёвыя льготы для сваёй збяднелай калоніі, абяцаюць сабраць габрэяў, якія носяць брытанскую жоўтую зорку, а потым адправіць іх у лагеры. У сваю чаргу Чэрчыль і антынацысцкая апазіцыя сышлі ў падполле, каб падрыхтаваць ўзброены мяцеж. Варта адзначыць, што альтэрнатыўнае мінулае Сэнсама становіцца сродкам адлюстравання з'яў сучаснай рэчаіснасці. Аўтар рамана дае зразумець, што фашысцкі нацыяналізм, які выклікае ў яго агіду, можа аднойчы расквітнець і ў Брытаніі. У якасці прыклада пісьменнік узгадвае сучасную Шатландскую нацыянальную партыю, якую Дж. Сэнсам адлюстраваў у рамане паўфашысцкай калабарацыяністкай арганізацыяй.

Нягледзячы на фантастычную канву, падзеі альтэрнатыўнай рэальнасці даюцца як праз праз факталогію і аналіз сапраўднай гісторыі, так і праз прызму ўспрымання жывых людзей, часта рэальных вобразаў. Альтэрнатыўная мастацкая трактоўка гісторыі не служыць апазіцыяй да рэалістычнага ці гістарычнага рамана, а, наадварот, дапаўняе рэчаіснасць. Пісьменнікі разглядаюць фашызм як адвечную небяспеку, вылучаюць тэзіс аб магчымасці новай сусветнай вайны, выкліканай адраджэннем аўтарытарызму на фоне супярэчнасцяў цывілізаванага грамадства.